А. М. Седзянеўскі

# ЛЁС МАІХ ЗЕМЛЯКОЎ У ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

Дзядуля мне расказваў аб падзеях Вялікай Айчыннай вайны. 22 чэрвеня 1941 г. жыхары Савецкага Саюза пачулі па радыё аб'яву аб пачатку вайны. На захопленых землях фашысты ўводзілі так званы "новы парадак" – рэжым беззаконня, гвалту, грабяжу і крывавага тэрору. На тэрыторыі Гудзевіцкага сельсавета акупацыя пачалася з расправы над актывістамі і прыхільнікамі Савецкай улады. Нацысты расстралялі Ілью Хомку, яго швагра Юльяна Ланцэвіча, міліцыянера Уладзіміра Нагача, братоў Івана і Мікалая Пазнякоў, Мікалая Іваноўскага, Аляксандра Ваўчка і Сцяпана Матыля. Усе мясцовыя жыхары павінны падпарадкоўвацца толькі нацыстскім звышчалавекам. У час акупацыі на тэрыторыі Гудзевіцкага сельскага Савета працавалі тайныя школы. Па-руску вучыла дзяцей Баламут Зінаіда Львоўна, па-польску – Пяжынская Францішка Мацвееўна (в. Радзявічы), пабеларуску – Белакоз Вера Мікалаеўна (в. Ляткі), а ў в. Вострава – Жалезняковіч Дзмітрый Вітальевіч. Дзяцей вучылі па савецкіх падручніках. Кожны ішоў у школу з задавальненнем. Нягледзечы на небяспеку, піянерцы Н. Хомцы (Зайцавай) удалося зберагчы сцяг піянерскай дружыны. 7 лістапада 1944 г. ён быў перададзены ў Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей. На падставе дадзеных камісіі па расследаванні і ўстанаўленні злачынстваў, здзейсненых нямецка-фашысцкімі захопнікамі на тэрыторыі Мастоўскага раёна, якія знаходзяцца ў Дзяржаўным архіве Гродзенскай вобласці, высветлена, што нямецкія захопнікі адбіралі мужчын і здаровых жанчын і заганялі на прымусовыя работы. Так, з Мастоўскага раёна было адпраўлена ў нямецкае рабства 780 чалавек, у тым ліку 287 жанчын і 27 дзяцей. У 1943 г. 13 сакавіка камісарам Фрэйманам быў выдадзены загад па Мастоўскаму раёну: "Явиться всем жёнам командного состава Красной Армии на перерегистрацию". 150 жанчын былі акружаны нямецкімі салдатамі. Затым па загаду ў маці забралі дзяцей і ўсіх жанчын павялі пад аховай да чыгуначнай станцыі, дзе загрузілі ў вагон і павезлі ў Германію. Дзяцей, якія беглі за сваімі маці, гітлераўцы таптралі коньмі, машынамі. Растраляна, замучана і спалена было 2681 чалавек мірнага насельніцтва (у тым ліку 1917 невядомых). Растраляна з агульнай колькасці 282 жанчыны, 143 дзіцяці ва ўзросте ад 6 месяцаў да 14 гадоў. У вёсцы Чарлёнка Малькавіцкага сельсавета некім быў забіты нямецкі салдат. Каб адпомсціць мірнаму насельніцтву, фашысты схапілі ўсіх старых, жанчын і дзяцей – 79 чалавек і растралялі. У вёсцы Пескі, Пескаўскага сельсавета немцы сагналі старых, дзяцей і прывезеных хворых, больш за 35 чалавек, у памяшканне, а затым спалілі. У вёсцы Шчара 17 снежня 1942 г. немцы за сувязь з партызанамі растралялі ні ў чым не павінных 85 чалавек. Пры ўскрыцці агульнай магілы роднымі аказалася, што асобныя з ахвяр з завязанымі вачыма закапаны жывымі. У вёсцы Шчара фашысты спасылаючыся на тое, што будуць вывезены на работу ў Германію адабралі 12 дзяўчат ва ўзросце ад 16-18 гадоў і павезлі з сабою ў лес, дзе іх згвалцілі, а затым па-зверску забілі. Сярод вывезеных на работу ў Германію была і Цыдзік Алена Геранімаўна, якая да сваей смерці пражывала ў вёсцы Сядзеневічы Мастоўскага раёна. У сваіх успамінах яна расказвае аб тых нялёгкіх днях. Вызваленне Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў прыйшло летам 1944 г. Вярнулася з вайны 105 чалавек. Зараз жывуць толькі два ветэраны Вялікай Айчыннай вайны. Гэта – Хомка Іван Антонавіч і Грыгуць Часлаў Сцяфанавіч. Вайна скончылася, але баліць сэрца.

### *Список литературы*

1. Памяць. Мастоўскі раён. – Мінск: ПК Паліграфафармленне, 2002. – 591 с.

*Седеневский Антоний Мечиславович*, студент 1 курса ФИТУ БГУИР, sedenevski@mail.ru.
*Научный руководитель: Николаева Людмила Викторовна*, заведующий кафедрой гуманитарных дисциплин БГУИР, кандидат исторических наук, доцент, Mikalayeva@bsuir.by